# ЯК СТУДЭНТЫ-ФІЛОЛАГІ Ў ПОЛЬШЧЫ ПАБЫВАЛІ

У межах лінгвакраіназнаўчай практыкі група студэнтаў філалагічнага факультэта нашай альма-матар наведала Зеленагурскі ўніверсітэт (Польшча). Ужо каторы год нашыя хлопцы і дзяўчаты выязджаюць на кароткатэрміновую практыку ў Інстытут неафілалогіі Зеленагурскага ўніверсітэта, а польскія равеснікі наведваюць нашу ВНУ. Гэта адбываецца згодна з падпісаным пагадненнем аб супрацоўніцтве паміж дзвюма навучальнымі ўстановамі. Сёлетняя паездка стала для машэраўцаў выдатнай магчымасцю пашырыць свой кругагляд, завесці новыя знаёмствы, больш даведацца пра матэрыяльную і духоўную культуру польскага народа, пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні.

Надзвычай займальна праходзілі заняткі па польскай мове, якія праводзіла Люцыя Кульваноўска. Люцыя – непасрэдны носьбіт мовы, вельмі прыемны і жыццярадасны чалавек. Яна навучыла нашу моладзь штодзённым выразам, якія спатрэбіліся пры зносінах з мясцовымі жыхарамі.

Заняткі праходзілі ў нязмушанай, сяброўскай атмасферы. І гэта вельмі важна, калі выкладчык можа зацікавіць і прывабіць да сябе, каб студэнты не адчувалі моўных бар'ераў. Хлопцы і дзяўчаты атрымалі каласальны вопыт, удасканалілі свае веды, папоўнілі слоўнікавы запас.

Асаблівае значэнне ў навучанні было нададзена фразеалогіі і граматыцы: машэраўцы чыталі і разбіралі тэксты, адказвалі на пытанні, пераказвалі змест і такім чынам развівалі тэхніку чытання і камунікатыўныя ўменні. Акрамя таго, студэнты-філолагі былі пастаянна акружаны польскай мовай: слухалі радыё па дарозе ва ўніверсітэт, чыталі надпісы на шыльдах, пыталіся, як і куды прайсці ў горадзе.



Уразіла іх бібліятэка Зеленагурскага ўніверсітэта, якая налічвае больш за мільён рознага кшталту выданняў: кніг, часопісаў, мапаў, мікрафільмаў. Функцыянуе і Зеленагурская электронная бібліятэка, дзякуючы якой у студэнтаў і выкладчыкаў на дыстанцыйнай аснове ёсць доступ да крыніц ведаў, адукацыйных рэсурсаў, копій помнікаў літаратуры, калекцый твораў мастацтва.

На нашу думку, дзеля эфектыўнага вывучэння польскай мовы (ды і наогул замежных моў) проста неабходна пабываць у краіне яе непасрэдных носьбітаў. Бо без ведання культуры, традыцый Польшчы, мы ніколі не зразумеем сапраўднага паляка.

**Вікторыя СІГАЁВА,**
**Аліна ВОЙТ,**
**студэнткі 4 курса ФлФ.**